Дзень друку – асаблівы дзень асаблівага года

10:11 / 05.05.2021

5 мая – асаблівы дзень для журналістаў: уся пішучая брацыя адзначае прафесійнае свята – Дзень друку. Сёлетні год для супрацоўнікаў «Астравецкай праўды» асаблівы яшчэ і тым, што 80 гадоў назад выйшаў у друк нумар нашай «раёнкі». А 4 мая 2021 года мы выпусцілі ўжо 8 958 нумар.



За кожным такім нумарам праца дзясяткаў людзей – часам нябачная і непрыкметная, але вельмі важная. Бо «выпа гэтай кагорты хаця б адзін работнік – адразу ж калектыву рэдакцыі стане цяжэй!

А такіх – таленавітых, творчых, адказных і адданых справе, роднай газеце і раёну – супрацоўнікаў сапраўды было і застаецца шмат. Вельмі хочацца, але наўрад ці мы зможам аднавіць імёны і біяграфіі ўсіх тых, хто некалі ўнёс укла развіццё і станаўленне «Астравецкай праўды» – рэдактараў, адказных сакратароў, карэспандэнтаў, фотакарэспандэ работнікаў друкарні... Аднак кожнаму з іх мы ўдзячны за тое, што яны рабілі газету і пакінулі нам яе ў спадчыну.



За 80 гадоў выданне прайшло вялікі шлях. Двойчы «раёнка» мяняла назву: «Большэвісцкі арганізатар», «Сталінская праўда», «Астравецкая праўда». Адбываліся змены і ў абліччы газеты, перыядычнасці яе выхаду і колькасці старона тэматыцы публікацый і паліграфічным выкананні. З’явіўся сайт, групы «раёнкі» ў сацыяльных сетках і тэлепраграма ТВой Астравец». Аднак заўсёды заставалася галоўнае прызначэнне газеты – служыць людзям, расказваць аб галоўн падзеях, якія адбываюцца ў краіне, вобласці і раёне, пра працаўнікоў прадпрыемстваў, якія ўносяць уклад у развіцц Астравеччыны і рэспублікі, пра нашых юных зорачак і многае-многае іншае.

На працягу васьмідзесяці гадоў менавіта з газетных старонак чытач даведваўся, як збіраюць ураджай, будуюць аб’е вучаць у школах і лечаць людзей, скараюць спартыўныя вяршыні і выхоўваюць дзяцей.

У газеты вялікая гісторыя – і нам ёсць, чым ганарыцца. Нам шанцавала на актыўных, творчых людзей, у нас заўсёд шмат і будзе яшчэ больш сяброў.

Сёння калектыў рэдакцыі – гэта невялікая, але дружная каманда, якая жыве агульнай справай, зберагаючы атрыма стараючыся прымножыць яго. І мы абавязкова будзем рухацца наперад, радаваць вас новымі праектамі, артыкула

конкурсамі, дасягненнямі і разам з вамі пісаць гісторыю роднай Астравеччыны.
Больш за 100 нумароў у год атрымліваеце вы, нашы паважаныя чытачы. За імі хаваюцца тысячы напісаных тэкстаў размешчаныя на газетнай паласе, сайце і старонках у сацыяльных сетках; сотні сюжэтаў – знятых, змантіраваных і выпушчаных у эфір – тэлепраграмы «ТВА. ТВой Астравец» і сотні выпускаў радыё «Гарадок». Нам прыемна, што поб намі ўвесь час, знаходзіцеся вы, нашы чытачы і нашы любімыя героі!
Дзень друку – гэта і ваша свята. Бо менавіта вы на працягу васьмі дзесяцігоддзяў падказвалі тэмы для публікацый, н на раён, былі галоўнымі крытыкамі артыкулаў, фотаздымкаў, відэаматэрыялаў многіх пакаленняў журналістаў, якія працавалі і працуюць цяпер у рэдакцыі.
І мы дзякуем вам за тое, што і сёння вы з намі! Што, як і шмат гадоў таму, вы чытаеце «раёнку», а цяпер яшчэ і захо на наш сайт і ў суполкі ў сацыяльных сетках, слухаеце выпускі радыё і глядзіце тэлепраграму – спадзяюся, гэта прадоўжаць рабіць вашы дзеці і ўнукі.

Подписывайтесь на телеграм-канал «Островецкая правда» по короткой ссылке https://t.me/ostrovetsby.

Телеграм-канал «Островецкая правда» – всё самое интересное из жизни Островца и Островецкого района.

Подписывайтесь на телеграм-канал «Гродно Медиа Group» по короткой ссылке t.me/GrodnoMediaGroup.

Телеграм-канал «Гродно Медиа Group» – это ежедневные новости районов Гродненской области и города Гродно.

Текст:

Поделиться:

Похожие новости



Александр Вольфович и Сергей Шойгу провели встречу в Москве



Астравецкая сям'я Жук пабывала на прыёме ў губернатара Гродзенскай вобласці



Пообещал – слово сдержал: дорогу прогрейдировали



Астравецкія айбаліты, ці Чым займаюцца спецыялісты райветстанцыі

© Все права принадлежат редакции газеты «Астравецкая праўда».

При использовании публикаций сайта и материалов групп в социальных сетях ссылка на источник и автора обязательна.

Перепечатка материалов – только с письменного разрешения редакции. Любые изменения текстов, заголовков, фотографий при перепечатке ЗАПРЕЩЕНЫ. Активная и индексируемая гиперссылка на источник обязательна.